Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-02-06

# На тым тыдні

✓**З 4 па 15 лютага** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва працавала **групавая выстаўка жывапісу «Крыніца святла»**.

У экспазіцыі былі прадстаўленыя працы вядомых каларыстаў З. Літвінавай і М. Бушчыка, а таксама Рыгора Іванова і Рыгора Несцерава, вядомых як аўтараў эсэ, прысвечаных жывапісу і ролі мастацтва ў грамадстве.

✓**З 4 лютага** ў зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пачала працаваць **юбілейная выстаўка «Класік беларускай паэзіі»**, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі, перакладчыка Аркадзя Куляшова.

Выстаўка знаёміць з кнігамі паэзіі «Росквіт зямлі» (1930), «Па песню, па сонца!..» (1932), «Сасна і бяроза» (1970) і інш. Летась паэма «Сцяг брыгады» адзначыла 70-гадовы юбілей. Гэта першы буйны твор пра Вялікую Айчынную вайну ва ўсёй савецкай літаратуры. На выстаўцы прадстаўленыя і першая публікацыя паэмы (часопіс «Знамя», № 2 – 3, 1943), і асобныя яе выданні, а таксама пераклады твора на рускую і ўкраінскую мовы. Сярод экспанатаў – розныя выданні зборніка «Новая кніга» (1964), які стаў значнай падзеяй на творчым шляху А. Куляшова. Зборнік быў перакладзены Я. Хелемскім на рускую мову.

На працягу ўсёй творчай дзейнасці паэт шмат перакладаў. На выстаўцы можна пазнаёміцца з перакладамі твораў А. Пушкіна, М. Лермантава, С. Ясеніна, А. Твардоўскага, Т. Шаўчэнкі, М. Рыльскага і інш.

Выстаўка працуе да 10 сакавіка.

✓**6 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа прайшла **музычна-паэтычная вечарына «Аркадзь Куляшоў. Ад Бесядзі да акіяна»**, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і ЦНБ НАН Беларусі. Да мерапрыемства было прымеркаванае **адкрыццё кніжнай выстаўкі «…І сэрца абпалена смагай радка»**.

Пад час імпрэзы ўвазе ўдзельнікаў была прадстаўленая відэапрэзентацыя матэрыялаў выстаўкі (рукапісы, нататнікі, узнагароды і іншыя асабістыя рэчы класіка беларускай літаратуры).

У вечарыне ўзялі ўдзел родныя і сябры А. Куляшова, даследчыкі і пісьменнікі.

✓**З 5 па 9 лютага** ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» прайшла **XXI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш**, у якой прынялі ўдзел каля 600 удзельнікаў з 26 краінаў свету.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні